УДК 811. 161. 3’42

# МАЎЛЕНЧА-ДЫЯЛАГІЧНЫЯ ФІГУРЫ Ў МОВЕ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ АЛЯКСЕЯ ПЫСІНА

***В. Ю. Святлова*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***Д. А. Карпечкіна***,
канд. філал. навук, дацэнт

Яркім стылістычным сродкам у мове паэтычных твораў Аляксея Пысіна выступаюць маўленча-дыялагічныя фігуры, з дапамогай якіх паэт так актыўна ўздзейнічае на аўдыторыю, пераконвае ў сваім успрыняцці свету, што адрасат часткова пазбаўляецца самастойнасці ў ацэнцы з’яў, падзей, фактаў. Прааналізуем асноўныя з іх.

Рытарычнае пытанне – рытарычная фігура маўлення ў форме запыту, які ставіцца для максімальнага акцэнту ўвагі на з’яве, падзеі, факце або ўвогуле на тэме прамовы: “Я спынюся ля траў непамятых, / Я спынюся ў цёмнай вады: / Ці даўно ў плашч-палатках напятых / Тут прайшлі без аглядкі гады?” [1, с. 55]. З мэтай узмацнення выразнасці маўлення эмацыйным зваротам да нерэальных субяседнікаў Аляксей Пысін выкарыстоўвае рытарычны зварот: “Ды прызнаўся хлопец у журбе: / «Дарагая! Быццам колас спелы, / Звернут я каханнем да цябе!»” [1, с. 181]. Рытарычны вокліч у вершах паэта служыць для выражэння пачуццяў і прыцягнення ўвагі адрасата маўлення, дзе эмоцыі тых або іншых пачуццяў выражаюцца з дапамогай інтанацыі: “Столькі сонца, / Гукаў, гулу / Сёння ёсць, / Паўторыцца пасля!” [1, с. 6]. А з мэтай выражэння роздуму або сумнення А. Пысін выкарыстоўвае дубітацыю, якая будуецца ў форме шэрагу пытанняў субяседніку для пастаноўкі праблемы і абгрунтавання разважання: “Можа, вясны было мала / Ў межах спадчыны сціплай маёй? / Можа, ўзнімала, / матляла // Блізкая роднасць з далёкай зямлёй? // Можа самому ў дакор / Мне не ставала спякотных адгадак: / Ці ў Пяцігорску пяць гор, / Ці ў Пяціхатках пяць толькі хатак?” [1, с. 71]. Для імітацыі свабоднага дыялогу паэт ужывае пытальна-адказавы ход, калі прамоўца фармулюе пытанне (пабуджае аўдыторыю да роздуму), і сам адразу ж адказвае на яго: “…Ты, журба, як адчутая страта, / Вы, трывогі, адкуль, ад каго? / – А мы – дзеці, мы – дзеці камбата, / Мы – адзіныя дзеці яго.” [1, с. 166].

Такім чынам, маўленча-дыялагічныя фігуры ўзмацняюць сэнсавую выразнасць паэтычнага радка паэта, надаючы словам і выразам дадатковыя сэнсавыя адценні, ствараюць настраёвасць верша, дыялагізуюць маўленне.

**Літаратура**

1. **Пысін, А.** Выбраныя творы : у 2 т. / А. Пысін. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – Т. 1 : Вершы / [прадм. Р. Бярозкіна]. – 304 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова